информация считается аналогичной объекту, то в стратегической информационной войне, наоборот, вводимая информация адаптирует под себя имеющуюся среду.

УДК 376.2

# ІНКЛЮЗІЎНАЯ АДУКАЦЫЯ Ў ВЕК ІНФАРМАЦЫЙНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ

Дайняк А.М.
Беларускі нацыянальны тэхнічныўніверсітэт

Інфармацыйныя тэхналогіі дазволілі зрабіць даступнай вышэйшую адукацыю для людзей з абмежаванымі магчымасцямі здароўя. Гэты працэс пачаўся з фармавання нарматыўна-прававой базы. У шэрагу краін заканадаўчыя асновы сталі выпрацоўвацца на мяжы XX-XXI стагоддзяў яшчэ да прыняцця Канвенцыі ААН "Аб правах інвалідаў" (13.12.2006 г.). Так, у ЗША былі прыняты тры законы, якія вызначылі падмурак сістэмы вышэйшай адукацыі для людзей з абмежаваннямі здароўя. Для большасці дзяржаў гэта работа пачалася з прыняцця Канвенцыі ААН, дзе ў артыкуле аб адукацыі ўказана аб даступнасці ўсіх узроўняў адукацыі для асоб з абмежаванымі магчымасцямі і аб абавязку дзяржаў, якія падпісалі і ратыфікавалі гэты дакумент, забяспечыць даступнасць і безбар'ернасць вышэйшай адукацыі для інвалідаў.

Пры прыёме асоб з інваліднасцю на навучанне ў ВНУ развітых краін важным момантам з'яўляецца адсутнасць любых абмежаванняў па захворваннях і прапанаваных спецыяльнасцях з-за заканадаўча замацаванай забароны дыскрымінацыі ў адносінах да людзей з абмежаванымі магчымасцямі здароўя.

У такіх краінах, як ЗША, Канада, ФРГ, Вялікабрытанія, адукацыя для людзей з інваліднасцю не з'яўляецца бясплатнай. Для кампенсацыі матэрыяльных затрат студэнтам аказваецца дапамога, выплачваюцца стыпендыі, прадастаўляюцца гранты, ільготы, афармляюцца крэдыты для аплаты як адукацыйных, так і дадатковых паслуг. Гэтыя выдаткі бяруць на сябе дзяржаўныя органы, няўрадавыя арганізацыі і фонды, тэрытарыяльныя органы і самі ўніверсітэты. У прыватнасці, у ЗША вышэйшым навучальным установам выгадна мець студэнтаў з інваліднасцю, т.я. дзяржава выдзяляе значныя сродкі на суправаджэнне навучэнцаў дадзенай катэгорыі. Абавязковай умовай аказання фінансавай падтрымкі з'яўляецца прадастаўленне публічных справаздач аб расходаванні сродкаў ВНУ. Студэнты-інваліды завочнай формы адукацыі

ў брытанскіх ВНУ атрымліваюць студэнцкія выплаты на набыццё спецыяльнага абсталявання - камп'ютара, сканэра, спецыялізуючага праграмнага забеспячэння і іншых сродкаў, а таксама пастаянную падтрымку абсталявання ў адпаведнасці з індывідуальнымі патрэбамі.

Важным складнікам вышэйшай адукацыі для людзей з абмежаванымі магчымасцямі здароўя ў замежных краінах з'яўляецца стварэнне сервісных цэнтраў або службаў падтрымкі студэнтаў-інвалідаў. Так, у Каралеўскім універсітэце Белфаста дзейнічае Цэнтр падтрымкі інвалідаў. Служба па рабоце з інвалідамі шмат гадоў функцыянуе ў Эдынбургскім універсітэце. У ЗША найбольш вядомымі з'яўляюцца: Кансультацыйны цэнтр па абслугоўванні інвалідаў у Дзяржаўным універсітэце Х'юстана, Упраўленне прадастаўлення паслуг інвалідам у Тьюлейн універсітэце і інш. У ФРГ Кансультатыўная служба для студэнтаў з абмежаванымі магчымасцямі або хранічнымі захворваннямі дзейнічае з 1977 года пры Тэхнічным універсітэце Дортмунд. Аналагічныя Службы працуюць ва Універсітэце Вупперталь, у Гейдэльбергскім універсітэце, у Берлінскім тэхнічным універсітэце.

Акрамя гэтых цэнтраў на кожным факультэце, інстытуце, дэпартаменце ВНУ ёсць адказныя (каардынатары) па справах інвалідаў, а ў ВНУ ЗША, Вялікабрытаніі абавязковай умовай з'яўляецца наяўнасць пасады амбудсмэна - спецыяліста, які правярае захаванне і рэалізацыю ўсіх правоў студэнтаў з абмежаванымі магчымасцямі здароўя. Акрамя таго, асаблівую цікавасць выклікае наяўнасць спецыялістаў, якія суправаджаюць студэнтаў з абмежаваннямі ў навучальна-выхаваўчым працэсе. Суправаджэнне ажыццяўляецца па сямі напрамках: тэхнічнае, педагагічнае, псіхалагічнае, медыка-рэабілітацыйнае, сацыяльнае, фізкультурна-спартыўнае і прафесійнае.

Гэтыя і іншыя асаблівасці ў атрыманні вышэйшай адукацыі студэнтамі-інвалідамі дазваляюць ім паўнавартасна рэалізаваць сваё права на атрыманне адукацыі, што ў сваю чаргу дэманструе высокія паказчыкі суадносін колькасці студэнтаў з абмежаванымі магчымасцямі здароўя да агульнай колькасці студэнтаў. Паводле даных Нацыянальнага цэнтра статыстыкі адукацыі Міністэрства адукацыі ЗША, у ВНУ краіны навучаецца больш як 4 млн. студэнтаў з інваліднасцю, што складае амаль 20 працэнтаў ад агульнай колькасці студэнтаў. Гэта самы высокі паказчык у свеце. У ФРГ і Вялікабрытаніі гэтая лічба складае каля 6% ад агульнай колькасці навучэнцаў.

Гэты вопыт цікавы і карысны для ўсіх краін, якія толькі пачынаюць свой шлях у вырашэнні праблемы даступнасці вышэйшай адукацыі для людзей з інваліднасцю і гэты працэс значна аблягчаюць новыя тэхнічныя сродкі і тэхналогіі.